«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Лабарантку "Гродна Азоту" асудзілі на паўтара года "хатняй хіміі" за счэпку на "Маршы адзінства"

30.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



На "Маршы адзінства" ў Гродна 6 верасня 2020 года. Фота: Hrodnalife

Жыхароў Гродна працягваюць судзіць за ўдзел у "Маршы адзінства", які адбыўся ў горадзе летась 6 верасня. Праз год, 6 верасня 2021-га, у Гродне адбыліся дзясяткі затрыманняў удзельнікаў таго марша. І цяпер суды адзін за адным выносяць абвінаваўчыя прысуды ў дачыненні да гэтых людзей.



Два гады "хатняй хіміі" за "счэпку". Гродзенцаў працягваюць судзіць за ўдзел у леташнім "Маршы адзінства"

Гэтым разам суд Кастрычніцкага раёна Гродна разгледзеў крымінальную справу 28-гадовай бухгалтаркі Дар'і Давідовіч. Дзяўчыну прызналі вінаватай ва ўдзеле ў "Маршы адзінства" 6 верасня мінулага года паводле ч. 1 арт. 342 КК — "Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх".

26 лістапада суд Кастрычніцкага раёна Гродна разгледзеў крымінальную справу ў дачыненні да 35-гадовай лабаранткі хімічнага аналізу прадпрыемства "Гродна Азот" **Вольгі Белазёравай**. Справу разглядала суддзя **Вольга Бекушава**, дзяржаўнае абвінавачванне падтрымлівала **Вераніка Ульянава**.

Вольга Белазёрава працуе на "Гродна Азоце" з 2006 года. Начальнік лабараторыі, у якой працуе жанчына, у характарыстыцы адзначыў, што яна *"зарэкамендавала сябе высокакваліфікаваным граматным спецыялістам, з'яўляецца адным з найдасведчаных інструктараў вытворчага навучання, можа ў самы кароткі тэрмін навучыць ізноў прынятага лабаранта выкананню лабараторных аналізаў"*. Жанчына выхоўвае пяцігадовую дачку.

Паводле абвінавачвання, Вольга Белазёрава ўдзельнічала ў счэпцы грамадзян на "Маршы адзінства" ў Гродне 6 верасня мінулага года ў 13:20 каля дома № 10 па вуліцы Гарнавых. *"Натхняючы сваімі паводзінамі навакольных з мэтай падахвочвання ў іх пачуцця неабходнасці ўдзелу ў паказаным несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве — мітынгу,*

правядзенне якога замахвалася на грамадскі спакой, парушала ўмовы адпачынку і побыту грамадзян, дэманстравала свой намер аказаць відавочнае непадпарадкаванне".

Сведкі ў пагонах хаваліся за шырмай. У Гродне за счэпку ў "Маршы адзінства" да 2,5 гадоў "хатняй хіміі" асудзілі 62-гадовую прыбіральшчыцу

Справу разглядаў суддзя Дзмітрый Кедаль, дзяржаўнае абвінавачванне падтрымлівала Алена Пранько. На самым пачатку судовага разгляду пракурорка зачытала хадайніцтвы супрацоўнікаў міліцыі, якія прасілі дапытваць іх за шырмай, бо "ў выпадку пазнавання тыя асцерагаюцца за сваё жыццё і здароўе".

Абвінавачваная прызнала віну ў поўным аб'ёме, пры гэтым адзначыўшы, што не згодная з тым, што яна нібыта загадзя ведала пра тое мерапрыемства і дзейнічала паводле папярэдняй змовы, паколькі з ейнага боку дзеянні былі спантаннымі. З 6 па 10 верасня гэтага года яе затрымлівалі па крымінальнай справе і змяшчалі ў ІЧУ. Адказваючы на пытанні дзяржаўнага абвінаваўцы, Вольга Белазёрава растлумачыла, што ў той дзень адправілася ў кнігарню набыць дачцэ інтэрактыўны глобус. Выходзячы з крамы, накіравалася ў бок прыпынку, дзе і далучылася да натоўпу грамадзян, пасля чаго пайшла ў бок вуліцы Савецкай і старога моста, — растлумачыла жанчына.

Сведкі-міліцыянты **Валянцін Сташэўскі**, **Мікалай Задорын**, **Ала Сафонава** і **Сяргей Цімафееў** на пасяджэнне не з'явіліся. У дачыненні да іх былі прынятыя меры бяспекі ў выглядзе невыдавання звестак аб іх асобах. Дзяржабвінаваўца падала суду дакумент, у адпаведнасці з якім сведкі знаходзяцца за межамі горада і занятыя аховай грамадскага правапарадку ў ТЛЦ "Брузгі".

Як высветлілася падчас абвяшчэння пісьмовых матэрыялаў, у справе *"знаходзяцца копіі прысудаў суда, якія ўжо вынесеныя ў дачыненні да асобаў, што ўдзельнічалі 6 верасня 2020 года ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве".*

Падчас вывучэння відэазапісу затрыманняў на маршы дзяржабвінаваўца сказала, што на заплечніку Вольгі Белазёравай была бел-чырвона-белая стужка: *"Адкуль бчб-стужачка ўзялася на заплечніку? Загадзя ведалі пра правядзенне мерапрыемства? Да гэтага насілі стужкі на сваім заплечніку?"*. На што абвінавачаная адказала, што не насіла на заплечніку бчб-стужку. Аднак Вераніка Ульянава працягнула: *"Калі вы насілі яе да гэтага, гэта адно, але калі вы наўмысна яе змясцілі дзеля ўдзелу ў маршы — гэта іншае!"*.



Магніт на лядоўні прызналі доказам па справе аб удзеле ў "Маршы адзінства". За гэта гродзенка атрымала два гады "хатняй хіміі"


15 лістапада ў судзе Кастрычніцкага раёна Гродна распачаўся разгляд крымінальнай справы ў адносінах да 52-гадовай Валянціны Будрэвіч. Паводле ч. 1 арт. 342 КК Беларусі ("Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх") жанчыну вінавацяць ва ўдзеле ў "счэпцы" падчас "Маршу адзінства" 6 верасня мінулага года. Справу разглядаў суддзя Уладзімір Пазняк, дзяржаўнае абвінавачванне падтрымлівала Вераніка Ульянава.

Падчас судовых спрэчак дзяржаўная абвінаваўца адзначыла, што па гэтай справе змякчальнымі акалічнасцямі з'яўляюцца чыстасардэчнае раскаянне і наяўнасць у Вольгі Белазёравай малой дачкі. Прадстаўніца пракуратуры прапанавала прыбраць з абвінавачвання ўказанне на дзеянні абвінавачанай паводле папярэдняй змовы, паколькі падчас судовага следства гэта не было выяўлена. Вераніка Ульянава прапанавала суду прызнаць жанчыну вінаватай і прызначыць ёй пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на два гады ("хатняя хімія").


29 лістапада суддзя Вольга Бекушава вынесла прысуд і прызначыла пакаранне на паўгода меншае за тое, што прасіла дзяржабвінаваўца ў судовых спрэчках: паўтара года "хатняй хіміі".

Опубликовать










Агляд навінаў палітвязняў з 5 па 13 снежня


"Чалавек выгаворвае табе ўсе свае страхі". Як аказваюць медыцынскую і псіхалагічную дапамогу асуджаным да смяротнага пакарання

"Пусціўся ў слэм пад "Груз", а ў галаве — ўспаміны пра тыдзень у халодным ШІЗА..." Вялікая размова з экс-следчым, асуджаным па "справе карагодаў"

У анкахворага палітвязня прагрэсуе хвароба. Ён праходзіць курсы хіміятэрапіі ў турэмнай лякарні







Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Як былыя палітвязні пасля вызвалення бароняць правы зняволеных

Судзяць мужчыну, які падтрымліваў дабраахвотнікаў ва Украіне

Месцы, забароненыя для пікетавання: у Баранавічах – праблемна і лайт-рэжым на раёне

Як рыхтуюцца да адзінага дня галасавання на Шчучыншчыне?

Крымінальная справа супраць супрацоўнікаў тэлеканала, ліквідацыя літоўскага клуба: хроніка пераследу 13-14 снежня (дапоўнена)

Агляд навінаў палітвязняў з 5 па 13 снежня

За "балабола" на адрас Лукашэнкі ў "чаце Барадача" – адзін год калоніі

Катаванні позай, пагроза пазбаўлення бацькоўскіх правоў. Як


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ


Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Лістапад 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre Memorial

Московская Хельсинкская Группа

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY